# БРЫЛЕЎСКІ летапіс

№ 7 (7)
ліпень
2006 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца
з мая 2006 г.


# Гетман Мазепа выбраў Брылі



kamunikat.org

с.2

# Брылеўскі шлях гетмана Мазепы

Плынь гісторыі нетаропка і няспынна вандруе з дня сёняшняга ў дзень мінулы. І часам над гэтай таемнай ракой уздымаюцца хвалі ўспамінаў аб мінулым - і мы пачынаем слухаць галасы сведкаў. А калі ў гэтай гаворцы мільгаюць знаёмыя назвы, то пачынаеш разумець, наколькі цікавымі могуць быць гістарычныя перакрыжаванні…

Адкрыўшы нумар “Магілёўскай праўды” ад 14 ліпеня 2006 года і ўчытаўшыся ў артыкул вядомага краязнаўцы Барыса Сідарэнкі, я, шчыра кажучы, быў прыемна здзіўлены. Думаю, што і чытачы “Брылеўскага летапісу” падзеляць мае пачуцці, убачыўшы вось гэтыя радкі:

*“...Того же года (1706), - сообщает игумен Орест, - для встречи гетмана Ивана Мазепы, шедшего с Малороссийским войском, посланы были из Могилёва магистратские чиновники с вином, мёдом, хлебом и другими съестными припасами. Гетман Мазепа принял благосклонно поднесённые ему дары, благодарил, в город же Могилёв не поехал, но стоял три дня недалеко от Могилёва в деревне Брилях; а потом отправился к Московскому государю”.*

**Хто ж такі гетман Мазепа і чаму ў сёняшняй Украіне выяву з яго тварам змяшчаюць на грашовых банкнотах?**




Нарадзіўся Іван Сцяпанавіч Мазепа 2 сакавіка 1639 г. ў сяле Мазепінцы недалёка ад Белай Царквы ў сям’і праваслаўнага шляхціча. Атрымаў вельмі добрую адукацыю ў Кіева-Магілянскай калегіі, іезуіцкай калегіі ў Варшаве. Вывучаў ваенную справу і дыпламатыю ў вядучых навучальных установах Італіі, Францыі і Нідэрландаў. У 1659 годзе пачынае службу пры двары польскага караля Яна Казіміра. Любоўная гісторыя з жонкай польскага шляхціча вымусіла Мазепу пакінуць двор і з’ехаць на Украіну. Кажуць, што і там раўнівы муж, даведаўшыся пра здраду жонкі, прывязаў Мазепу да спіны дзікага каня, тварам да хваста, і пусціў каня ў стэп. Параненага Мазепу знайшлі казакі, вызвалілі і прывецілі. Сярод казакоў і казацкай вярхушкі Мазепа хутка вылучыўся і зрабіўся бліжэйшым паплечнікам гетмана левабярэжнай Украіны Міхаіла Дарашэнкі. У 1674 г. Мазепу захапіў атаман Сірко і перадаў ў рукі гетмана правабярэжнай Украіны Івана Самайловіча. І на новым месцы наш герой хутка прайшоў шлях да ўладных вышынь. У 1687 г. пасля смерці Самайловіча гетманам быў абраны менавіта Мазепа. Пад адзінай булавой ён аб’яднаў украінскія землі. Як сапраўдны дыпламат, ён завязвае сяброўскія адносіны з расійскім імператарам Пятром І, дапамагае яму ў ваенных справах. Баявыя і асабістыя заслугі гетмана Мазепы перад Расійскай імперыяй былі такія вялікія, што ў 1700 годзе Пётр І ўзнагароджвае яго вышэйшай адзнакай імперыі - ордэнам Андрэя Першазванага. Дарэчы, Іван Сцяпанавіч зрабіўся яго другім кавалерам.



Вайсковая пячатка І.Мазепы

Але, калі прыйшлі звесткі аб тым, што Пётр І плануе знішчыць гетманшчыну, Мазепа вырашыў скінуць маскоўскія аковы. У палітычнай сітуацыі тых часоў адзіным магчымым саюзнікам быў шведскі кароль Карл XII. На гэту паўночную краіну звяртаў увагу яшчэ Багдан Хмяльніцкі, які адным з варыянтаў бачыў Украіну ў шведскім саюзе. Дарэчы, з таго часу нават колеры дзяржаўных сцягаў гэтых краін аднолькавыя - жоўта - блакітныя.

З 1705 па 1709 год гетман вядзе актыўныя перамовы з пасламі шведскага караля, а таксама з пасламі Станіслава Ляшчынскага - караля Польшчы. У той жа час выказваў павагу і да Пятра І, і яго вандроўка ў Маскву праз нашы Брылі - таму сведчанне…

Але ўсё тайнае калісьці робіцца наяўным, і Пётр І даведаўся пра сепаратныя перамовы Мазепы. Гетман, не чакаючы царскай помсты, з’явіўся ў лагеры караля Карла XII. Удзельнічаў на баку шведаў у Палтаўскай бітве 1709 г. і пасля разгрому шведскага войска разам з Карлам падаўся да турэцкага султана. Пётр І прапанаваў султану 300.000 залатых за жывога Мазепу, але султан адмовіўся выдаць гетмана. Сілы ў Івана Сцяпанавіча да таго часу былі ўжо падарваныя, і 22 жніўня 1709 г. ён памёр. Быў пахаваны ў Святагорскім манастыры румынскага горада Галац.

**Вось такім быў жыццёвы шлях гетмана Івана Сцяпанавіча Мазепы, для якога вызваленне роднай Украіны ад маскоўскага ўплыву зрабілася сэнсам жыцця. Таму і ўглядаецца ён задаволена з грашовых банкнот на сваю неньку-радзіму, якая з кожным годам робіцца мацнейшай і прыгажэйшай. І, здаецца, у тым, што мары гетмана спраўджваюцца, ёсць і наша, брылеўская, кропля.**

***Мікола ЯЦКОЎ.***

Зямля і людзі

### САКРЭТЫ УСХОДНЯЙ МЕДЫЦЫНЫ
*( працяг, пачатак у № 6, 2006)*

**4. Развивайте силу ума.** Во многих восточных языках, в том числе и в китайском, понятия «ум» и «сердце» выражаются одним словом. После достижения того уровня, когда вас больше не беспокоят личные амбиции, когда вы можете забыть о себе и развивать свое сердце, вы получаете средство освобождения от болезней.

**5. Управляйте своим половым влечением и не позволяйте ему управлять вами.**

**6. Соблюдайте правило: «Держи голову в холоде, а ноги в тепле».** Так вы наверняка избежите накопления слишком большого количества энергии в голове, из-за которого можете чувствовать дискомфорт или даже болеть. Если слишком много энергии идет в голову, может повыситься кровяное давление. Отводя энергию к стопам, вы можете понизить давление, а следя за тем, чтобы ноги были теплыми, — предотвратить сердечный приступ. Так что растирайте стопы и грейте их.

**7. Держите шею в тепле.** В ней есть много кровеносных сосудов и нервов, идущих по направлению к (или от) очень важной части вашего тела — головы. Поэтому ей тоже нужно уделять большое внимание: следите за тем, чтобы она была в тепле, чтобы она не была напряжена.

**8. Соблюдайте мудрость в питании.** Не переедайте. Вставайте из-за стола незадолго до полного насыщения и затем совершайте лёгкую прогулку; никогда не ешьте перед сном. Ешьте меньше, но чаще. Так вы обеспечите хорошее пищеварение и не будете перегружать пять важных органов.

**9. Соблюдайте умеренность.** Слишком длительная ходьба вредит связкам; слишком длительное сидение вредит мышцам; слишком длительное стояние вредит костям; слишком длительное лежание вредит жизненной энергии; слишком длительное созерцание вредит крови. Гнев, печаль, сожаления и меланхолия вредны, как и слишком сильная радость или удовольствие. Говоря кратко, вредно не соблюдать умеренность.

**10. Ухаживайте за здоровьем, учитывая времена года.** Зимой следите за тем, чтобы ногам было тепло, а голове — прохладно. Весной и осенью позвольте и голове, и ногам ощущать прохладу.

Летом и осенью рано ложитесь спать и рано вставайте; зимой ложитесь рано и вставайте поздно; весной ложитесь спать, пока светло, и вставайте рано.

Нарассвете, в полдень, после обеда, в сумерках и в полночь чистите зубы и полощите рот — это продлит вашу жизнь и укрепит кости, зубы, мышцы, ногти и волосы.

Культура

**З інтэрв'ю Алы Міхайлаўны ВАСІЛЕНКА, дырэктара Магілёўскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна:**

**"Самае галоўнае, каб новыя кнігі траплялі ў бібліятэкі своечасова і даходзілі да чытача. Неабходна, каб дзіця ў той жа вясковай бібліятэцы мела магчымасць атрымаць любімую кнігу і ў добрай паліграфіі. Бо калі яно сёння не атрымае таго, што павінна атрымаць у дзяцінстве, дык пазней, хутчэй за ўсё, да гэтага ўжо не вернецца... Безумоўна, кніга павінна выхоўваць чалавека. І чым раней пачнецца далучэнне да яе, тым больш адукаваным і культурным будзе чалавек".**

СБ беларусь сегодня

**17 ліпеня 1936 года радыёстанцыя горада Сеуты ў іспанскай каланіяльнай зоне Марока некалькі разоў перадала ў эфір фразу "Над усёй Іспаніяй бязвоблачнае неба", якая была ўмоўным сігналам для пачатку ваеннага мяцяжа супраць урада Іспанскай рэспублікі. Узнялі яго прадстаўнікі вышэйшага афіцэрскага корпуса, буйныя землеўладальнікі і духавенства, незадаволеныя прыходам да ўлады ў лютым 1936 года урада, у якім моцныя пазіцыі займалі Камуністычная і Сацыялістычная партыі. 19 ліпеня па мадрыдскаму радыё выступіла член парламента, віцэ-старшыня Камуністычнай партыі Іспаніі Даларэс Ібаруры, якая прызвала ўвесь іспанскі народ узняцца на абарону рэспублікі. Вядомыя словы з гэтага выступу: "Но пасаран!" - "Яны не пройдуць!" - зрабіліся баявым дэвізам антыфашысцкіх сіл усяго свету.**

# Брылеўская бібліятэка інфармуе...



Рэспубліка



**Прэзідэнт Рэспублікі Польшча Лех Качыньскі прызначыў кандыдатам на пасаду прэм'ер-міністра свайго брата-блізнюка Ярaслава Качыньскага. Як кажуць дасведчаныя людзі, такога ў гісторыі Польшчы яшчэ не было. Прапануючы чытачам "Брылеўскага летапісу" паглядзець на гэты здымак і адказаць - дзе тут Лех, а дзе Яраслаў Качыньскі?**

Літаратура і мастацтва

**У раздзеле "Паэзія" звяртае на сябе ўвагу верш сёлетняй выпускніцы адной з мінскіх школ Таццяны Анікеенка:**

***Малітва***

**Адвядзі на лес грымоты,**
**Уратуй нас ад самоты,**
**Дай нам мудрасці стагоддзяў -**
**Навядзі на шлях, Гасподзе!**
**Сілы, моцы дай нам, Божа,**
**Выратуй!**
**Не ты, дык хтож, а?**
**Святы Дух, Айцец ды Сын,**
**Светлых дзён нам дай!**
**Амін.**

Звязда

**Мінчанка Ганна Адамаўна Барысевіч адзначыла сваё 118-годдзе. Старэйшая жыхарка Беларусі нарадзілася 1 ліпеня 1888 года. Усяго ж у рэспубліцы на 1 ліпеня гэтага года 100-гадовы рубеж пераступілі 724 чалавекі.**

Могилевская правда

**Па дадзеных абласной падатковай інспекцыі, самы вялікі прыбытак за 2005 год, задэклараваны фізічнай асобай на Магілёўшчыне, склаў амаль 216 мільёнаў рублёў. Што цікава: гэта - не прадпрымальнік. З гэтай сумы дэкларант унёс больш 33 мільёнаў рублёў падаходнага падатку.**

*Старонку падрыхтавала бібліятэкар Брылеўскай сельскай бібліятэкі Ала ЯЦКОВА*

# Палёт у вечнасць



УДЗЕЛЬНІКІ ПАХОДА

Па шляху, падказаным нашымі аднавяскоўцамі Мікалаем Аўдзеевічам Баранавым і Мікалаем Дзмітрыевічам Смаляковым ( гл. "Брылеўскі летапіс"№ 5, 2006 ) пайшла 17 ліпеня ваенна-патрыятычная экспедыцыя, арганізаваная Домам культуры, бібліятэкай і школай. Убачыць месца падзення савецкага баявога самалёта выказалі жаданне Андрэй Сідзельнікаў, Дзмітрый і Станіслаў Васюрэнка, Канстанцін Пшанічны і Аляксей Паршнёў. Негледзячы на даволі вялікую адлегласць, атрад ішоў пехатою - як гэтага і патрабуе сапраўдны паход.

Уважліва і с хваляваннем агледзелі удзельнікі той памятны забалочаны луг, на які 26 чэрвеня 1941 года ўпалі з рэшткамі абгарэлых парашутаў нашы лётчыкі. На свае вочы пабачылі і дарогу, па якой іх павезлі ў калясцы матацыкла да месца пахавання.

Праз некалькі хвілін, пераадолеўшы з паўкіламетра лясной дарогі і буралом, экспедыцыя выйшла да вялікай яміны, дзе і знайшоў свой апошні прычал баявы самалёт. Пасля дасканалага візуальнага агляду гэтага месца узнікла думка, што трэба з цягам часу усё тут прывесці ў парадак - каб іншыя людзі змаглі прыйсці і аддаць даніну павагі мужным воінам, што ў тыя чэрвеньскія дні ўзняліся ў паветра на баявое заданне і здзейснілі свой апошні палёт. Палёт у вечнасць.

*Ала ЯЦКОВА.*



Месца, дзе знайшлі лётчыкаў



На месцы падзення самалёта



Па гэтай дарозе лётчыкаў павезлі

# Брылеўскі Грунвальд



У нашым жыцці здараюцца самыя неверагодныя супадзенні...

Роўна 596 гадоў таму, 15 ліпеня 1410 года, каля вёскі Грунвальд у Прусіі (сёння Ольштынскае ваяводства Польшчы) адбылася адна з самых вялікіх бітваў Сярэднявечча. У ёй сышліся армія Тэўтонскага ордэна і саюзнае войска Каралеўства Польскага і Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Падзея гэта мела сваю перадгісторыю.

Першы крыжовы паход германцаў супраць славян Папа Рымскі Яўген III благаславіў яшчэ ў 1147 годзе. Ударнай сілай крыжаносцаў на Ўсходзе зрабіліся германскія рыцарскія ордэны, запрошаныя польскімі феадаламі. Прыйшоўшы як госці, крыжаносцы хутка адчулі сябе гаспадарамі на чужых землях і пачалі захопліваць адну вобласць за другой. Да пачатку XV стагоддзя Тэўтонскі ордэн знаходзіўся на вяршыні магутнасці. Небяспека, якая ішла з боку прагных да чужога рыцараў, якія надумалі "канчаткова вырашыць усходняе пытанне", прымусілі Польшчу і Вялікае княства Літоўскае аб'яднацца перад агульнай пагрозай.

І на полі пад Грунвальдам адбылася вялікая бітва, якая спыніла нямецкую агрэсію ў славянскія землі. Усе разам, плячом да пляча, беларусы, палякі, рускія, літоўцы, украінцы, чэхі бязлітасна білі крыжаносцаў. Адзін дзень Грунвальда знішчыў хвалу і моц ордэна. З гэтага часу пачаўся занепад тэўтонцаў. Грунвальдская бітва з'явілася прыкладам воінскай доблесці і баявой садружнасці славян у барацьбе за свабоду...

Не ведаю, як адбываюцца перакрыжаванні лёсу, але 17 ліпеня, амаль у дзень гадавіны, у Брылях адбыўся свой Грунвальд - не такі маштабны, але даволі адчувальны.

У якасці захопнікаў выступіла шайка "паддатых" трыццацігадовых дзецюкоў, прыбарабаніўшых да нас на дзвух легкавушках. Кажуць, што некага з гарадскіх у мінулую суботу тут пакрыўдзілі, дык уся ягоная радня у тыя легкавушкі і набілася. Разбірацца прыехалі. І першым, хто трапіў ім на вочы, быў Андрэй Дубоўскі. Суванулі хлопцу ў грудзі, павалілі, пачалі тузаць нагамі. І вось тут узняўся наш Грунвальд: адусюль пачалі збягацца брылеўцы і без усялякіхназіранняў адразу рынуліся ў гушчар бітвы. А калі ў руках некаторых нашых раптам з'явіліся вілы і тапары, то чужынцы вырашылі не зведваць лёс і сыпануліся да сваіх аўтамабіляў. Чалавек дзесяць (!) жвава зашчаміліся ў цесныя "Жыгулі" і зніклі з хуткасцю гука. А вось другой машыне так не пашанцавала: наперарэз кінуліся Віктар Міхайлавіч і Кацярына Аркадзьеўна Новікавы і затрымалі налётчыкаў. З замка зажыгання з боем былі выдраны ключы. І нават з'явіліся баявыя раненні: Раісу Васільеўну Кірылаву заціснуты шафёр укусіў за руку, імкнучыся забраць ключы ад сваёй машыны. Даволі хутка пад'ехаў міліцэйскі "УАЗік", і пачалося састаўленне пратакола аб здарэнні...

І гэта добра, што брылеўцы так узняліся супраць чужой навалы. Бо толькі разам, агульнымі намаганнямі можна адбіцца ад любога ворага. Як гэта рабілі нашы продкі. Подых Грунвальда - з намі.

*Мікола ЯЦКОЎ.*

# Агнявы віхур





Пажар на вёсцы - заўсёды страшна. I калі 15 ліпеня на другім пасёлку загарэлася хата Ганны Іпалітаўны Букатнёвай, разам з чорным дымам у неба ўзняліся вясковая ўладкаванасць і спакой. Дзесяцігоддзямі нажытае ў момант ператварылася ў попел. Згарэла жывёла, што была ў хляву. Нават яблыневая лісто-та ў садзе ля хаты спяклася ад агню і зрабі-лася жоўтага колеру. Можна назваць цудам тое, што полымя аніяк не закранула лазню, дзе ў гэты момант знаходзіліся сама гаспадыня і дзеці.

Як сказалі ўсхваляваныя суседзі, дым адразу паказаўся з боку хлява, і вельмі хутка ўсё палыхнула. Можа, усё пайшло ад замыкання электраправодкі, а можа мела месца неасцярожнасць з агнём. Гэтаму паспрыяла і шматдзённая спякота, - драўляныя збудаванні ў такіх выпадках гараць, нібы порах. Асабліва шкада новую печ, якую толькі што склалі і два разы паспелі натапіць для прасушкі.

Ганна Іпалітаўна разлічвае на хуткую фінансавую дапамогу "Дзяржстраха", бо разам з абавязковай мела і дзве асабістыя страхоўкі. I спадзяецца на дапамогу сельсавета і фірмы "Днепр" у набыцці будаўнічых матэрыялаў, бо трэба ладзіць хату. Трэба жыць.

*М. Я.*

# Гартаючы пажоўклыя старонкі...

*2 ліпеня 1997 г.*

Прыдняпроўская НІВА

## Прыжылася ў Брылях расіянка



Не думала - не гадала **Валянціна Пятроўна Карочанка**, што лёс яе, рускую па нацыянальнасці, закіне з Новасібірска ў невялікую беларускую вёсачку.

Так выйшла, што ёй па сямейных абставінах давялося пакінуць родныя абжытыя месцы і падацца разам з дачкой, як гаворыцца, "у свет". Гэтым "светам" аказалася вёска нашага раёна Брылі - цэнтр калгаса імя Ільіча.

І сёння можна сказаць, што вёсцы, дакладней яе жыхарам, пашанцавала на такога чалавека, як Валянціна Пятроўна.

Справа ў тым, што яна загадчык магазіна. А прадавец на вёсцы - асоба даволі важная. Менавіта ад яе ў многім залежыць быт вясковага чалавека.

Раней у гэтым магазіне прадаўцы часта мяняліся. Асартымент тавараў быў вельмі бедны. З прыходам сюды Валянціны Пятроўны ўсё стала інакш. Якіх толькі тавараў тут няма! Каўбас - некалькі відаў, розных макаронных вырабаў - таксама, пра цукеркі і казаць не трэба - на любы густ і па розных цэнах. Галоўны тавар - хлеб і хлебабулачныя вырабы - завозяцца рэгулярна, тройчы на тыдні: па аўторках, чацвяргах і суботах. Практычна не знікаюць з прылаўка магазіна ні цукар, ні алей, ні розныя іншыя тлушчы, згушчонае малако, розныя тушонкі, кансервы. Няма перабою ні з пральнымі парашкамі, ні з мылам, іншымі прадметамі гігіены.

Тым, хто жадае набыць буйную, дарагакаштуючую пакупку, скажам, розную складаную тэхніку, мэблю, таксама не трэба ехаць за ёй у горад. Дастаткова сказаць аб гэтым прадаўцу. Яна зробіць заяўку, і тавар праз некаторы час будзе дастаўлены пакупніку.

Уражвае і парадак у магазіне. Акуратна зроблена выкладка тавараў. На кожным з іх цэннік. А самае галоўнае - вас заўсёды сустрэне ветлівая жанчына з пяшчотнай усмешкай на вуснах, прыемным рускім гаварам. Як гасцінная гаспадыня, распытае, што жадаеце набыць, падкажа, што сёння новае ў продажы, а што ўжо заказана на базе і чакаецца на днях

У гандлі вельмі многае значыць рэклама. Валянціна Пятроўна ўмее стварацъ яе якасным таварам. Таму пакупнікі рэдка выходзяць з магазіна без набытай рэчы. Аб гэтым сведчыць і даволі высокі тавараабарот у Брылеўскім магазіне. Калі ў маі ён складаў 130 мільёнаў рублей, што значна больш плана, то ў чэрвені ён ужо ўзрос да 140 мільёнаў рублёў. Такіе лічбы пераконваюць, што магазін працуе стабільна. І пакупнікі задаволены работай заўмага. Нездарма ў кнізе водгукаў і прапаноў, што вядзецца ў магазіне, толькі падзякі Валянціне Пятроўне Карочанка за яе добрасумленную і такую патрэбную людзям работу.

За восем год, што жыве і працуе расіянка ў Брылях, палюбілі яе вяскоўцы. Аўтарытэтным чалавекам стала. Прыжылася на гэтай зямлі.

Калгас выдзеліў Валянціне Пятроўне двухпакаёвую кватэру. І дачка сям'ю сваю тут стварыла. Так што жыццё працягваецца.

І напярэдадні прафесійнага свята хочацца пажадаць ёй далейшых поспехаў у працы і асабістым жыцці.

**М. АНДРЭЕЎ.**

**НА ЗДЫМКУ:** загадчык магазіна вёскі Брылі Валянціна Пятроўна Карочанка.

**Фота С. ТРАЦЭЎСКАГА.**

# Гандляры завіталі ў Брылі



Фота Ю.Яцковай



Кожны раз, калі ў гаспадарцы даюць палучку, у Брылях ля сталовай з'яўляюцца гандляры з шырокім асартыментам ўсялякіх патрэбных тавараў. І адразу робіцца шматлюдна. І практычна ніхто не адыходзіць з пустымі рукамі ад самаробных прылаўкаў.

## Літаратурная старонка

# Марина Степченкова

**Вечер**

Солнце уходит - остались мгновенья,
Красный закат - как судьбы
мановенье.
Тёмные церкви сияют крестами,
Шепчут молитву немыми устами.

В парках и скверах сгущаются
краски -
Там оживают волшебные сказки...
С прожитым днём попрощаться пора,
Властвовать ночь будет здесь до утра.



* * *

Я не Рембо и не Верлен,
Я не Цветаева,
не Пушкин.
Не веет ветер перемен,
Не сохнут слёзы на подушке.

Я не ловлю настрой в тиши,
И надо мной не реют стяги.
Я состояние души
Хочу оставить
на бумаге.

Інфармацыйна-грамадскі бюлетэнь
для жыхароў Брылеўскага рэгіёна
і наваколля.
Распаўсюджваецца бясплатна.
Наклад 50 асобнікаў.

Адрас для карэспандэнцыі:
213107 Магілёўскі раён п/а Брылі
тэл. маб. 3732886, 218449, 218498
e-mail: nvff@rambler.ru
© "Брылеўскі летапіс", 2006

Заснавальнік
і рэдактар
Мікола
ЯЦКОЎ